Смерць нямецкім акупантам!
Камуністычная Партыя (большэвікоў) Беларусі

Прачытай і перадай другому.

# ЗА РАДЗІМУ

Орган Мозырскага РК КП(б)Б
№3 Нядзеля, 10 кастрычніка 1943 г.

Бібліятэка АН БССР

**ПАБЕДА ЧЫРВОНАЙ АРМІІ—ГЭТА ПАБЕДА ЖЫЦЦЯ НАД СМЕРЦЮ, ШЧАСЦЯ НАД ГОРАМ, СТВАРЭННЯ НАД РАЗРУШЭННЕМ.**

# Чырвоная Армія працягвае наступаць!

## Мозыр быў і будзе Совецкім

Хуткімі тэмпамі рос і развіваўся наш Мозыр. Кожны дзень яго жыцця прыносіў новыя і новыя перамогі.

З адсталага, захалуснага гарадзішка, ён вырас у буйны абласны горад.

Больніцы, клубы, школы, бібліятэкі, педагагічныя і медыцынскія навучальныя ўстановы—усё было пастаўлена на службу працоўным горада

Прышоў немец. Усё разрушыў. Больш 900 чалавек замучылі гестапаўцы. Няма таго дня, каб у Мозыры не расстралялі 20-30 чалавек.

Расстрэльваюць за ўсё: за нявыхад на работу, за нявыплату кватэрнай платы, за адказ ехаць у Германію, за распаўсюджванне чутак аб набліжэнні часцей Чырвонай Арміі і г. д.

Жудасныя дні перажывае Мозыр. Але хутка гэты двухгадовы кашмар знікне.

Воіны доблеснай Чырвонай Арміі ідуць да нас і над родным Мозырам зноў запалымнее Чырвоны сцяг—сцяг жыцця, шчасця, радасці і свабоды.

Працоўныя м а з ы р а н е! Адпомсцім гітлераўцам за акрываўлены Мозыр! Біце фашысцкую погань і ўдзень і ноччу! Не выпусцім жывым ні аднаго гітлераўца з роднага Мозыра!

Мозыр быў і будзе Совецкім!

Смерць нямецкім акупантам!

## На франтах Айчыннай вайны

### АПЕРАТЫЎНЫЯ ЗВОДКІ ЗА 7, 8 КАСТРЫЧНІКА 1943 Г.

Нашы войскі зноў разгарнулі наступальныя баі супроць нямецка-фашысцкіх войск па ўсяму фронту ад Віцебска да Таманьскага паўвострава.

Войскі Паўночна-Каўказскага фронта, паспяхова ліквідаваўшы плацдарм праціўніка на Таманьскім паўвостраве, занялі горад і порт Тамань і буйныя насялёныя пункты.

Войскі праціўніка, не паспеўшыя эвакуіравацца з паўвострава—знішчаюцца.

У паласе сярэдняга цячэння Дняпра нашы войскі паспяхова фарсіравалі раку Дняпро і захапілі плацдармы ў трох месцах: на поўнач ад Кіева, на поўдзень ад горада Пераслаўля і паўднёва-усходней Крэменчуга. Немцы вядуць супроць нашых войск, пераправіўшыхся цераз раку Дняпро, жорсткія контратакі, якія адбіваюцца з вялікімі для праціўніка стратамі.

Войскі Калінінскага фронта, прарваўшы моцна ўкрапленую абарону праціўніка працягам 25 клм., на глыбіню 25 клм., пасля 2-х дзённых жорсткіх баёў, авалодалі горадам і чыгуначным вузлом Невель, а таксама занялі звыш 100 іншых насялёных пунктаў.

На поўнач ад горада і чыгуначнага вузла Кірша, войскі Волхаўскага фронта, прарваўшы абарону праціўніка, прасунуліся ўперад на 15 клм. і з баямі авалодалі горадам і чыгуначным вузлом Кірш.

На працягу 6-га кастрычніка нашы войскі па ўсіх франтах падбілі і знішчылі 32 нямецкія танкі. У паветраных баях і агнём зянітнай артылерыі збіта 44 самалёты праціўніка.

* * *

На працягу 8 кастрычніка войскі Паўночна-Каўказскага фронта працягвалі ачышчаць Паўночную частку Таманьскага паўвострава і знішчылі рэшткі войск праціўніка.

У паласе цячэння Сярэдняга Дняпра нашы войскі працягвалі весці баі па расшырэнню плацдармаў на правым беразе ракі ў ранейшых раёнах.

На Віцебскім напрамку нашы войскі вялі наступальныя баі і, прасунуўшыся ўперад ад 8 да 12 клм., занялі больш 150 насялёных пунктаў і чыгуначную станцыю Заольша.

У р-не Невеля нашы войскі, працягваючы наступленне, занялі больш 60 насялёных пунктаў.

На працягу 7 кастрычніка нашы войскі на ўсіх франтах падбілі і знішчылі 50 нямецкіх танкаў. У паветраных баях і агнём зянітнай артылерыі збіта 87 самалётаў праціўніка.

жр 3234

# Акрываўлены Мозыр кліча да помсты!

## Душагубы

Усім добра памятаецца Мозыр да жніўня 1941 года. Азеляненыя вуліцы, асфальтавыя тратуары, белыя домікі, цудоўны сквер на беразе Прыпяці.

Але іншым выглядае Мозыр зараз. Немцы яго ператварылі ў канцэнтрацыйны лагер. Цэлыя кварталы аплецены калючай провалакай. На плошчы Леніна ўстанавілі шыбеніцу.

На ўсё жыццё застанецца ў маёй памяці 20-верасня 1942 г.

Раніцай, у нядзелю, немцы аб'явілі, што ў 2 гадзіны дня ўсе жыхары Мозыра павінны сабрацца на гарадскую плошчу па важнаму пытанню. У загадзе гаварылася, што за няяўку вінаўныя будуць карацца па законах ваеннага часу.

Бледныя, схудалыя пацягнуліся к плошчы гаражане. Але якi жудасны малюнак яны ўбачылі? Сярод плошчы стаяла шыбеніца і на ёй гойдаліся землякі.

Горад злавесшчна замёр. Толькі жандармы, пастукваючы кованымі ботамі, расхаджвалі па хутка апусцеўшых вуліцах і любаваліся свaёй ахвярай.

-- Калі ўспамінаеш, кроўю абліваецца сэрца. Што можа быць даражэй, як родны куток, які знішчаны? Што можа быць болей сумным, як бачыць мілыя вулічкі і дарожкі, па якіх бегаў у дзяцінстве, а зараз топчуцца фашысцкімі ботамі?

## Пры „новым" парадку

Цяжка жывецца працоўным Мозыра. Размяшчаючыся ў горадзе, немцы высяляюць жыхароў з дому за 2-3 гадзіны. Браць што-небудзь з абстаноўкі забараняюць, і людзі кідаюць у сваіх кватэрах мэблю, бялізну, пасуду і іншыя рэчы. Усё гэта падбіраюць гітлераўцы.

Хлеба выдаецца на працаздольнага па 200 грамаў і ў большасці-сурагаты.

На кожным кроку рыскаюць шпіёны. Эсэсаўцы хватаюць беззабаронных людзей на вуліцах, базарах і ў доме.

Такія прадажныя шкуры — нямецкія халуі, як Дубавец, Клокаў, Пакарскі, Халодны прадалі смерці не адзін дзесятак Совецкіх людзей. Больш тысячы працаздольных мазыран вывезены на катаргу ў Германію.

В. Майскі.



1-ЖИТЛО, 2-СНІДАНОК, 3-ОБІД, 4-ВЕЧЕРЯ

## У мозыры

У жывапіснай мясцовасці размешчан горад Мозыр. З надыходам лета ён увесь утапаў у зелені. З рання да вечара раздаваліся звонкія галасы юнакоў і дзяўчын на берагах спакойнай Прыпяці.

Тут, як і ў другіх нашых гарадах, днём і ноччу кіпела шладатворнае жыццё.

Горад, закінуты ў мінулым, не траціў сваёй жывапіснасці, а ўсё больш і больш разрастаўся, станавіўся ўзначна культурны і адміністрацыйны цэнтр.

Прышлі немцы людаеды і горад замёр. З першага дня яны знішчылі помнікі культуры, разграбілі багацейшыя габінеты педвучылішча, апустошылі гарадскую бібліятэку, вырубілі парк, не пашкадавалі і стагодніх дрэў на брацкіх могілках.

Ад такіх вуліц, як Пушкінская, М-Пушкінская, Савета, Рамашоў Роу і іншыя засталіся толькі назвы. Лепшыя памяшканні горада гестапаўцы ператварылі ў турэмныя засценкі.

—Кроў стыне ў жылах,— гаворыць Таня К., вырваўшаяся з фашысцкай турмы, — ад жудасных здзекванняў над совецкімі людзямі. Пры „СД" ёсць спецыяльна абарудавана комната з падвеснымі раменнямі для вырывання рук і ног у жывога чалавека, дошка, якую накладваюць на грудзі і б'юць двухпудовай гірай, крукі для выламвання рэбраў і іншыя сярэднявяковыя інструманты для катаванняў. Днём і ноччу даносяцца не чалавечыя крыкі з комнаты-душагубкі.

Днямі групу так званых „палітычна ненадзейных," эсэсаўцы прымусілі выкапаць сабе магілу, а потым жывымі засыпалі зямлёю.

Аблавы на базарах і на вуліцах сталі звычайнай з'явай для мазыран. Жыхары горада баяцца паказацца на вуліцу, каб не быць схопленымі і гвалтоўна адпраўленымі ў Германію.

Не ведаў наш старынны Мозыр за час сваёго існавання такіх цёмных і жудасных дней, якія перажывае зараз.

А. Васілёў.

Рэдакцыйная калегія.

Выд. Мозырскага РККП(б)Б.